CENTRALNA KOMISJA EGZAMINACYJNA

**WYPEŁNIA ZDAJĄCY**

| KOD | PESEL |
|---|---|
| | |

*miejsce na naklejkę*

# PRÓBNY EGZAMIN MATURALNY Z JĘZYKA BIAŁORUSKIEGO

## POZIOM ROZSZERZONY

DATA: **kwiecień 2020 r.**
CZAS PRACY: **180 minut**
LICZBA PUNKTÓW DO UZYSKANIA: **40**

**Instrukcja dla zdającego**

1. Sprawdź, czy arkusz egzaminacyjny zawiera 10 stron. Ewentualny brak zgłoś przewodniczącemu zespołu nadzorującego egzamin.
2. Pisz czytelnie. Używaj długopisu/pióra tylko z czarnym tuszem/atramentem.
3. Nie używaj korektora, a błędne zapisy wyraźnie przekreśl.
4. Pamiętaj, że zapisy w brudnopisie nie będą oceniane.
5. Możesz korzystać ze słowników językowych.
6. Na tej stronie oraz na karcie odpowiedzi wpisz swój numer PESEL i przyklej naklejkę z kodem.
7. Nie wpisuj żadnych znaków w części przeznaczonej dla egzaminatora.

NOWA FORMUŁA

MOB-R1_**1**P

Układ graficzny
© CKE 2015

**Wybierz jeden temat i napisz wypracowanie.**

**Тэма 1. На аснове дадзенага тэксту прадстаў праблему і паразважай над ёй. Карыстайся тэзісамі і думкамі Паўла Абрамовіча і звярніся да іншых тэкстаў культуры. Твая праца павінна налічваць не менш за 300 слоў.**

Павел Абрамовіч
***З якой глебы расце наш літаратурны сад?***

Беларуская літаратура стваралася на падставе вусна-паэтычнай спадчыны, калькавала ўсе яе ідэйна-эстэтычныя сэнсы і зместы, усю «праўду і крыўду» падзяляла як сваю. Працяглы час яна выдатна маскіравалася пад народныя казанні і песні, не жадаючы сабе нічога большага.

Калі карыстацца тэрміналогіяй амерыканскага даследчыка Р. Браўна, які падзяляў «высокую» і «масавую» літаратуру па прынцыпу «вынаходлівасці» (invention) і «прадказальнасці» (convention), дык можна сцвярджаць, што беларуская літаратура канца XIX-га – пачатка XX стагоддзя, ад Ф. Багушэвіча і да пісьменнікаў-«нашанівцаў», была цалкам прадказальнай, вытлумачальнай. Межы чытацкай аўдыторыі, яе густы і ўяўленні аб свеце і мастацкай творчасці, былі і межамі самой літаратуры. Нашы першыя паэты, празаікі і драматургі пачуваліся як рыбы ў вадзе народнай стыхіі. Не дзіва, што маладое слоўнае мастацтва адразу зрабілася *папулярным, масавым.* […]

З цягам часу, і гэта заўважна ў творчасці сяброў літаб'яднанняў «Маладняк» і «Узвышша», у беларускай літаратуры паболела вынаходніцтва, «штукарства»; мастацкае мысленне пісьменнікаў усё часцей пераадольвала межы звыклай акваторыі[1].

Аднак беларуская *invention* зусім не мела намеру распачаць супрацстаянне з *convention* альбо засведчыць уласную мастацкую незалежнасць, скласці маніфэст. К. Чорны, Ю. Віцьбіч, Л. Калюга, дзясяткі іншых літаратараў-«штукароў», якія ладзілі разнастайныя эксперыменты ва ўласнай творчасці, працягвалі заставацца масавымі пісьменнікамі. Сыны свайго народу, бязмежна ўдзячныя бацькоўскай зямлі, яны зусім не імкнуліся тварыць на самоце іншы, адметны вобраз свету, пасярод якога б ўзнімалася «Вежа са слановай косткі», апісаная Г. Флабэрам. Мастацтва дзеля мастацтва іх насамрэч не цікавіла – ніхто не збіраўся прысвячаць гэтаму жыццё.

У адрозненне ад М. Багдановіча, які «шукаў матэматычна правільнага і вернага спосабу ацэнкі твораў і прыйшоў да вываду, што такі спосаб можна знайсці, калі разлажыць твор на паасобныя абразы, звароты і словы» (В.Ластоўскі), «маладнякоўцы» і «ўзвышаўцы» пры ўсім сваім непадабенстве мелі намер і далей працаваць у рэчышчы народнай літаратуры. Тут, у звыклых вобразах і красках, было знаёмае здаровае жыццё, сапраўдная элітарнасць.

Паводле П. Абрамовіч, *З якой глебы расце наш літаратурны сад?*, https://www.svaboda.org

[1] Акваторыя – участак воднай паверхні.

**Тэма 2. Зрабі параўнаўчы аналіз і інтэрпрэтацыю вершаў. Твая праца павінна налічваць не менш за 300 слоў.**

Максім Багдановіч
***Маёвая песня***

*

*Музыка перш за ўсё...*
Поль Верлен

Па-над белым пухам вішняў,
Быццам сіні аганёк,
Б'ецца, ўецца шпаркі, лёгкі
Сінякрылы матылёк.

Навакол усё паветра
Ў струнах сонца залатых,
Ён дрыжачымі крыламі
Звоніць ледзьве чутна ў іх.

І ліецца хваляй песня, –
Ціхі, ясны гімн вясне.
Ці не сэрца напявае,
Навявае яго мне?

Ці не вецер гэта звонкі
Ў тонкіх зёлках шапаціць?
Або мо сухі, высокі
Ля ракі чарот шуміць?

Не паняць таго ніколі,
Не разведаць, не спазнаць:
Не даюць мне думаць зыкі,
Што ляцяць, дрыжаць, звіняць.

Песня рвецца і ліецца
На раздольны, вольны свет.
Але хто яе пачуе?
Можа, толькі сам паэт

М. Багдановіч, *Маёвая песня*, [у:] М. Багдановіч, *Поўны збор твораў,* т. 1, Мінск 2001б с. 75–76.

Рыгор Барадулін
***Матылёк***

*Б'ецца, ўецца шпаркі, лёгкі*
*Сінякрылы матылёк.*
Максім Багдановіч

Лілею
млявы
плёс
люляе,
З-пад злежаных
аблок
здалёк
Ляціць віхлясты і бялявы,
Пялёстак лёгкі –
матылёк.

Ён кліча у блакіт лілею,
Каб не любіла
больш
да слёз
Бліскучы ад лускі і глею,
Самлелы,
абмялелы
плёс,

Дзе лашчыць
цёплай ласкай
хваля
Лінёў –
злянелых цельпукоў,
Паблісквае
няблізка
далеч,
Дзе ў іле
не злічыць малькоў,
Дзе глыб
угнеўнена шыпела,
Калі
на хвалі
лівень
лёг...
Засумавалы,
белы,
белы
Ляціць удалеч
матылёк...

Р. Барадулін, *Матылёк*, http://baradulin.ru

# WYPRACOWANIE

**na temat nr....................**

..........................................................................................................................................

..........................................................................................................................................

..........................................................................................................................................

..........................................................................................................................................

..........................................................................................................................................

..........................................................................................................................................

..........................................................................................................................................

..........................................................................................................................................

..........................................................................................................................................

..........................................................................................................................................

..........................................................................................................................................

..........................................................................................................................................

..........................................................................................................................................

..........................................................................................................................................

..........................................................................................................................................

..........................................................................................................................................

..........................................................................................................................................

..........................................................................................................................................

..........................................................................................................................................

..........................................................................................................................................

..........................................................................................................................................

..........................................................................................................................................

..........................................................................................................................................

..........................................................................................................................................

..........................................................................................................................................................

..........................................................................................................................................................

..........................................................................................................................................................

..........................................................................................................................................................

..........................................................................................................................................................

..........................................................................................................................................................

..........................................................................................................................................................

..........................................................................................................................................................

..........................................................................................................................................................

..........................................................................................................................................................

..........................................................................................................................................................

..........................................................................................................................................................

..........................................................................................................................................................

**Tabelę wypełnia egzaminator!**

| | | Liczba punktów | Suma | Uzasadnienie przyznania 0 punktów |
|---|---|---|---|---|
| wypowiedź argumentacyjna | A. | 0 – 3 – 6 – 9 | | |
| | B. | 0 – 3 – 6 – 9 | | |
| interpretacja porównawcza | A. | 0 – 2 – 4 – 6 | | |
| | B. | 0 – 4 – 8 – 12 | | |
| | C. | 0 – 2 | | |
| | D. | 0 – 3 – 6 | | |
| | E. | 0 – 1 – 2 | | |
| | F. | 0 – 2 – 4 | | |
| | G. | 0 – 2 – 4 | | |
| | H. | 0 – 2 – 4 | | |

**BRUDNOPIS** ***(nie podlega ocenie)***